УДК 72.03 (476)

# КАТАЛІЦКАЕ ХРАМАБУДАЎНІЦТВА НА ПАСТАЎШЧЫНЕ Ў XV–XVIII стст.

**Савіцкая Святлана Валянцінаўна,**
Полацкі дзяржаўны універсітэт (г. Наваполацк, Беларусь)

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*У артыкуле разгледжана каталіцкае храмабудаўніцтва на Пастаўшчыне ў XV–XVIII стст. Вылучаны асноўныя этапы, дадзена характарыстыка асобным аб'ектам, прааналізавана іх архітэктурныя і мастацкія асаблівасці.*

У архітэктурным ланшафце Пастаўшчыны важнае месца займаюць каталіцкія храмы. У сучасных межах Пастаўскага раёна каталіцызм пачаў распаўсюджвацца з XIV ст. Да канца XVIII ст. гэтая канфесія з'ўлялася адной з распаўсюджаных у рэгіёне. За гэты перыяд на Пастаўшчыне быў пабудаваны шэраг адметных каталіцкіх храмаў.

Будаўніцтва касцёлаў на Пастаўшчыне распачалося ў XV ст. За перыяд XV–XVIII стст. вылучаюцца тры этапы ў каталіцкім храмабудаўніцве ў рэгіёне. Першы ахоплівае XV–XVI стст. У гэты перыяд святыні былі пабудаваны ў Лынтупах (1459 г.), Груздаве (1443 г.), Паставах (1522 г.). Касцёлы былі драўляныя і да нашага часу не захаваліся.

Першы касцёл у сучасных межах раёна быў пабудаваны ў Лынтупах. Як паведамляе хроніка парафіяльнага касцёла за 1879 г., ён быў заснаваны Андрэем Даўгірдовічам, віленскім ваяводам на сродкі ваяводства. Пабудаваны быў з моцных сасновых бярвенняў. Спачатку насіў імя Андрэя Апостала, а затым – Узнясення Маці Боскай. Галоўным упрыгажэннем касцёла былі пяць алтароў і амбона. Вялікай каштоўнасцю лічыліся званы. Адзін з іх меў вагу ледзь не восем пудоў. Касцёл струхлеў і быў разабраны [1, с. 7].

Груздаўскі касцёл Узвіжання Найсвяцейшага Крыжа упершыню згадваецца ў дароўнай грамаце парафіяльнаму касцёлу 3 лютага 1443 г. Гістарычныя дакументы прыгадваюць Груздаўскі касцёл "з фундуша Багдана Андрушковіча Саковіча". Быў вырашаны па тыпу трохнефавай двухвежавай базілікі. Сілуэт плоскаснага гарызантальнага амаляванага фасада фарміравалі трохвугольны франтон і бакавыя трохярусныя чатырохгранныя вежы са спічастымі шатрамі [5, с. 112]. Храм неаднаразова аднаўляўся. У верасні 1943 года нямецкія войскі пад час блакады спалілі касцёл.

З 1522 года пачынаецца гісторыя пастаўскай парафіі, менавіта тады, калі быў закладзены першы парафіяльны касцёл ў імя Непарочнага Зачацця Дзевы Марыі. Храм быў з дрэва, крыжовы ў плане з двума сакрысціямі па баках апсіды і дзвюма вежамі на галоўным фасадзе. Касцёл быў знішчаны ў 1840 годзе [6, с. 143].

Другі этап прыпадае на першую палову XVII стагоддзя. У гэты перыяд былі пабудаваны касцёлы ў Камаях (1606 г.) і Дунілавічах (1624 г.). Да нашага часу касцёлы не захаваліся. У другой палове XVII – першай палове XVIII стагоддзя, як сведчаць крыніцы, не было пабудавана каталіцкіх храмаў на тэрыторыі рэгіёна.

Трэці этап будаўніцтва касцёлаў прыпадае на другую палову XVIII ст. Гэты этап звязаны з распаўсюджаннем стыля барока ў рэгіёне. Для архітэктурных помнікаў віленскага барока характэрны маляўнічасць сілуэта, вытанчанасць і

вертыкалізм прапорцый, ажурнасць і пластычнасць фасадаў, пышнасць і разнастайнасць аздобы інтэр'ераў, крывалінейнасць абрысаў і прасторы, аптычныя эфекты [2, с. 408]. У гэты час былі пабудаваны каталіцкія храмы ў Дунілавічах 1769–1773 гг., у Лучаі ў 1776 г.; зроблена прыбудова капліцы са склепам да касцёла ў Камаях (1778 г.)

Троіцкі касцёл у Дунілавічах уяўляе трохнефавую двухвежавую базіліку з трансептам і прамавугольнай у плане апсідай. Апсіда знаходзіцца ўнутры базілікі. Вежы двухярусныя, завершаны купаламі з галоўкамі і раскрапаваны ўвагнутымі пілястрамі. Бакавыя фасады прарэзаны лучковымі вокнамі і дэкарыраваны спаранымі пілястрамі. Астатнія сцены прарэзаны лучковымі праёмамі і раскрапаваны спаранымі прамавугольнымі праёмамі. Па ўсім перыметры вокнавых сцен праходзіць шырокі карнізны пояс. Над ім у цэнтральнай частцы галоўнага фасада ўзвышаецца фігурны шчыт, злучаны з вежамі невялікімі валютамі. Сцены трансепта выгнутыя, завершаны фігурнымі франтонамі, над апсідай – шчыт са складаным крапаваным франтонам. Цэнтральны уваход у касцёл вылучаны парталам, якія перабудаваны ў XIX ст. ў формах класіцызму [3, с. 10].

У 1776 годзе быў заснавана касцёл у гонар Святога Тадэвуша ў Лучаі. Храм з'яўляецца цікавым прыкладам спалучэння прыёмаў барока і класіцызму. Касцёл уяўляе двухвежавую трохнефавую базіліку з паўцыркульнай апсідай і трансептам. Галоўны фасад фланкіруюць трохярусныя вежы, раскрапаваныя вуглавымі пілястрамі, нішамі, прарэзаныя прамавугольнымі аконнымі праёмамі (часткова замураваны). Пры перабудове верхні ярус вежаў завершаны купальнымі франтонамі. Галоўны фасад, апсіду і трансепт вянчаюць розныя па форме фігурныя шчыты. Сцены касцёла раскрапаваны пілястрамі. Па ўсім перыметры будынка праходзіць дарычны карнізны пояс, які злучае аб'ёмы шырокай цягай. Над ніжняй часткай бакавога прыдзела працягнуты антаблемент. Над ім узвышаецца атык, утвораны: цэнтральнай часткай, завершанай 3-ох вугольным франтонам, падтрымліваемым здвоенымі пілястрамі і – бакавых пілястр, злучаных з цэнтральнай часткай плаўнай лініяй плоскасці сцяны [4, с. 30].

Камайскі храм уяўляе сабой помнік архітэктуры абаронча-культавага дойлідства з рысамі стыляў готыкі, рэнесансу, барока. Абарончы характар будынку надаюць дзве асадзістыя цыліндрычныя вежы, што замыкаюць фасадную сцяну. Ярусы байніц дазвалялі весці агонь і фланкіраваць ўваход. Верхні ярус даваў магчымасць весці агонь на далёкую адлегласць. Два ніжнія ярусы байніц рэдкай чашападобнай формы, з вялікім сектарам абстрэлу, выкарыстоўваліся для абароны непасрэдных падступаў да будынка. Храм спачатку меў восевую сіметрычную кампазіцыю. Мяркуючы, па рэштках скляпенняў, быў трохнефавы, чатырохстоўпны. У сярэдзіне XVII ст., ў час пажару скляпенні абваліліся (не адноўлены). Суровы архітэктурны характар інтэр'ера храма змякчаецца і ўзбагачаецца насычанай пластыкай разнастайных скляпенняў: драўлянага люстранога – у нефе, старажытных, крыжовага і зоркавага – у апсідзе, цыліндрычнага з распалубкамі і падпружнымі аркамі – у капліцы [5, с. 168]. Сцены (таўшчыня 2 м) прарэзаны высокімі аконнымі праёмамі. Цэнтральны уваход вырашаны ў выглядзе аркі з спічастым завяршэннем. Галоўны фасад асноўнага аб'ёму мае трохвугольнае завяршэнне, раскрапаваны ў верхняй частцы паўцыркульнымі байніцамі [4, с. 14].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Такім чынам, Пастаўшчына адносіцца да рэгіёнаў з дастаткова ранняй гісторыяй каталіцкага храмабудаўніцтва. Пачынаючы з XV ст. у рэгіёне быў пабудаваны шэраг аб'ектаў, якія з'яўляюцца гісторыка-архітэктурнымі каштоўнасцямі не толькі для рэгіёна, але і ўсёй Беларусі. Да нашага часу захаваліся найбольш адметныя храмы ў Камаях, Лучаі, Дунілавічах, якія сталі важнымі турыстычнымі аб'ектамі рэгіёна.

## Літаратура

1. Быхавец, І. Лынтупы і наваколле. Гістарычны нарыс / І. Быхавец. – Паставы, 1993. – 83 с.
2. Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя: у 2 т. Т.1: Абаленскі – Кадэнцыя / Рэдкал.: Г.П.Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; Маст. З.Э. Герасімовіч. – 2-е выд. – Мінск: БелЭн, 2007. – 688с.
3. Зямчонак, І. Данілавічы 1473 – 1998 Гістарычны нарыс / І. Зямчонак. – Паставы: Сумежжа, 2004. – 65 с.
4. Зямчонак, І. Храмы Залатога паяса Пастаў / І. Зямчонак. – Мінск: Энцыклапедыкс, 2000. – 120 с.
5. Кулагін, А.М. Каталіцкія храмы Беларусі / А.М. Кулагін; фатограф А.Л. Дыбоўскі. – Мінск: БелЭН імя П. Броўкі. – 2008. – 488 с.
6. Татаринов, Ю.А. Города Белоруссии. Витебщина / Ю. Татаринов. – Минск: Энциклопедикс, 2006. – 208 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова